Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 43 (636). Wilnia, Niadziela 17 Listapada 1935 h. Hod XI (XIX)

MOKSLŲ AKADEMIJOS BIBLIOTEKA

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILŃIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Аб народных настроях

— Трэба пісаць пад настроі сяла, масаў — кажуць нам часта розныя людзі, што прыходзяць адведаць нашую рэдакцыю; — праўда, вы агулам бяручы, пад гэтыя настроі трапляеце, але гэта рабіць трэба яшчэ больш, дык «Бел. Крыніца», якая і так мае прыхільнасьці нямала ў народзе, тады будзе мець яшчэ больш — кажуць нам гэныя людзі. Ведама, гэткія і ім падобныя рады нашых супрацоўнікаў, прыяцеляў і прыхільнікаў мы заўсёды шчыра бяром да сэрца, разважаем. Унікаючы глыбей у сэнс гэных радаў, лёгка заўважваецца, што яны ідуць пераважна ў кірунку большай левасьці, дэмагогіі. Хоць — што яшчэ цікавей — здараюцца дарадчыкі, якія нам дараджаюць кірунак не такі ўжо «бальшавіцкі», не такі левы, а больш правы. Але гэткіх радаў, у параўнаньні з першымі, спатыкаем зусім мала.

Каб належна зразумець, як да гэтых радаў аднесьціся і з іх карыстаць, прадусім трэба ведаць, што такое настроі масаў і якая ім цана. Вось-жа часта гэныя настроі масаў — гэта адбіцьцё іх праўдзівых патрэбаў і праўдзівае зразуменьне нацыянальнага і агулам грамадзкага жыцьця. Але так-жа часта гэта зусім неразумныя, чыста самалюбныя пажаданьні. Знача, апірацца заўсёды і толькі на настроях масаў ніяк ня можна, бо з гэтага будзе толькі шкода, як для самых масаў, так і для ўсей грамадзкай і народнай беларускай справы.

Ніякія рэвалюцыянэры, палітыкі, дзеячы, вялікія павадыры масаў ніколі ня йшлі за масамі, а звычайна вялі за сабой масы, адпаведна іх настроіўшы да сваіх ідэалаў. Калі-ж аднак яны агітавалі за настроямі масаў, дык рабілі гэта дзеля таго, каб гэныя настроі выкарыстаць для нейкіх вышэйшых, агульнейшых ідэалаў. Многім напрыклад і сяголньня здаецца, што такі Ленін сапраўды рабіў тое, чаго хацелі масы. Тымчасам гэта так толькі здаецца. Добра гэта апісвае Троцкі ў сваіх кнігах аб вялікай расейскай рэвалюцыі. Ленін, як сьведча Троцкі, уважаў, што трэба абяцаць усё тым, каторыя нічога ня маюць, разбудзіць іх пажаданьні і настроі. Такія пойдуць на ўсё і сьлепа будуць трымацца сваіх бальшавіцкіх павадыроў. А як пры іх помачы ўсё процірэвалюцыйнае будзе збурана і зьнішчана, калі рэвалюцыйная ўлада як належыцца пачуецца на сіле, тады трэба будзе будаваць дзяржаву. Гэтак думаў Ленін і згодна з гэнымі сваімі думкамі паступаў. І сапраўды. Настроі масаў і пажаданьні «раю на зямлі», так настроямі, пажаданьнямі і асталіся, а тымчасам, калі ідзе аб канкрэтнае жыцьцё, дык паўстала савецкая дзяржава, у якой ужо аб настроях масаў гаворыцца як найменш, а найбольш аб рэальных, агульна-грамадзкіх магчымасьцях і патрэбах згодна з бальшавіцкай ідэолёгіяй.

Возьмем яшчэ больш блізкі нам і зразумелы прыклад Грамады. Камуністым, і здаецца яшчэ некаму, трэба было стварыць у Зах. Беларусі, калі ня зусім камуністычны, дык прынамсі да яго зьбліжаны, масавы рух. Падумана-зроблена. Пусьцілі цэлую горбу агітатараў, зайгралі на настроях масаў і стварылі шматтысячную Грамаду. І што ж з гэтага? Нічога. Настроі так і змарнаваліся, так і асталіся незаспакоенымі настроямі. І хто ведае, ці ня больш з гэтага ўсяго было шкоды, як карысьці. Але аб гэтым няхай судзіць гісторыя.

Для лепшага зразуменьня возьмем яшчэ прыклад выбараў у польскія соймы. Заўсёды розныя агітатары ігралі на настроях масаў, разбуджалі іх аж да гарачыні і прыракалі па выбарах споўніць іх. Па выбарах аднак аб гэтым усім цалком забываліся.

Дык як-жа адносіцца да настрояў? Што маем адказаць тым, якія нам радзяць ісьці за настроямі? Вось-жа ісьці за настроямі масаў бяз ніякіх засьцярогаў — гэта знача ў выніку гэныя масы ашуківаць. Мы на гэта ня йшлі дагэтуль і ісьці ня зьбіраемся.

Далей, бываюць пажаданьні і настроі неэтычныя, а так-жа й такія, якія споўніць ніколі немагчыма. Ясна, што і за гэткімі настроямі масаў ісьці і іх падтрымліваць няможна.

Ёсьць урэшце настроі і пажаданьні масаў зусім справядлівыя і магчымыя да зьдзейсьненьня, калі не зараз, дык прынамсі ў будучыне. Такія пажаданьні і настроі масаў трэба паддзержываць, будзіць і бароцца за іх зрэалізаваньне. Вось тут той пункт, у жыцьці масаў, на якім павадыры іх, палітыкі, дзеячы, інтэлігенцыя павінны з масай сьціснуцца лучыцца і супрацоўнічаць.

Мы, гэта знача людзі, якія групуюцца ад 19 гадоў каля „Бел. Крыніцы", каля БХД і якія будуць далей групавацца каля новай арганізацыі, што хутка прыйдзе на зьмену БХД, так-жа, думаем, павінны трымацца гэтага самага прынцыпу. Адкрыта і чэсна масы і іх павадыры супольна павінны бараніць усё тое, што сапраўды справядлівае, паступовае і карыснае ўсяму працоўнаму беларускаму народу і што, калі ня зараз, дык, як мы ўжо казалі, у будучыне, але ёсьць канкрэтным і асягальным.

З газэт.

Бяда з „Крэсамі"

„Słowo" (орган віленскіх манархістаў—буйных абшарнікаў) у № 286 з дня 18.X.35 друкуе артыкул нейкага Л. Брындзы-Нацкага — п. н. „Polskość a Kresy". Артыкул, ведамая рэч, бароніць клясавыя інтарэсы буйных земляўласьнікаў, паноў-абшарнікаў.

Аўтор не бяз крыку цьвердзіць, што „моцарствовая падстава—зямля, што знаходзіцца ў руках польскіх, у застрашаючы спосаб корчыцца", што „адбываецца працэс „topnienia" польскай уласнасьці" і гэты працэс ахапіў ня толькі ўсход Польшчы (чытай Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну), але і захад — землі з насельніцтвам нямецкім. А гэта ўсё — гэты працэс „topnienia" польскай уласнасьці — быццам настаў наўперад дзякуючы польскай палітыцы, дзякуючы аграрнай рэформе, якая змушае абшарнікаў дабравольна парцэляваць маёнткі — „ogniska, z których promieniowała polskość", як кажа аўтор артыкулу.

Значэньне польскіх двароў, паводле аўтара, вялікае, бо „jeżeli chodzi o polskość, garstka urzędników w mieście powiatowem ubytku dworów nie zastąpi, a promieniowanie polskości pod postacią docierającego nawet do odległych wsi sekwestratora lub komornika skutków dodatnich nie wyda, tego chyba nawet dowodzić nie potrzeba".

Ясна і выразна. Абшарнікі хочаць паўстрымаць парцэляцыю маёнткаў у імя абароны і пашырэньня польскасьці сярод няпольскага насельніцтва (Беларусаў, Украінцаў і Літоўцаў). Ведамая рэч, што працэс „topnienia" польскасьці на „Крэсах" — прадусім на беларускіх і украінскіх землях — настаў ня з прычыны аграрнай рэформы (бо-ж пры парцэляцыі маёнткаў сярод няпольскага насельніцтва аддаецца парцэляваная зямля на землях з гэтым насельніцтвам пераважна ў рукі польскіх асаднікаў, колёністаў), —гэны працэс настаў з прычыны узросту беларускай і украінскай нацыянальнай сьведамасьці у шырокіх гушчах беларускага і ўкраінскага народу. У адным мы толькі згодны з абшарніцкім пісакам, іменна у тым, што, як ён кажа: „po co było dążyć do posiadania Kraju, w ogólnym bilansie gospodarki narodowej niezaprzeczenie biernego" (уемнага), дадаючы ад сябе, што тут ідзець аб білянс польскай асыміляцыйнай палітыкі на абшарах з няпольскім насельніцтвам (беларускім, украінскім, літоўскім і інш.), а знача на „Kresach". Запраўды, бяда з гэтымі „Крэсамі"!...

U 20-yja ŭhodki śmierci ks. J. Ambraziejusa.

20 hadoŭ tamu, u 1915 h. u Wilni pamior ks. Jazep Ambraziejus. „Viln. Rytojus" z 6.XI. sioł. h., z nahody pastaŭleńnia ks. Ambraziejusu na Rosach pamiatnika, paświaciła jaho pamiaci artykuł, z jakoha dawiedwajemsia ab pracy jaho na litoŭskaj niwie i ab tym, što jon za hetu pracu ŭciarpieŭ. Za henaj hazetaj padajom tut i my hałoŭnyja wiestki ab słaŭnym baraćbicie za wolu i kulturu litoŭskaha narodu, jakija nie pazbaŭleny značeńnia i dla nas biełarusaŭ.

Ks. J. Ambraziejus byŭ adnym z pieršych pačynalnikaŭ litoŭskaha adradžeńnia ŭ Wilni. Prad pryjezdam swaim u Wilniu ad 1892 h. jon byŭ probarščam u roznych parafijach wilenskaj dyecezii. Paśla apynuŭsia ŭ Wilni, dzie i pačaŭ litoŭskuju adradženskuju pracu. Pracawaŭ z usich sił, kab uzbudzić u litoŭskim narodzie świedamaść. Hetaja praca ŭciahnuła jaho ŭ samy wir litoŭska-polskaj baraćby, jakaja była tady duża wostraja.

U 1906 h. ks. J. A. wydaŭ litoŭskuju katachizmoŭku, za jakuju pryšłosia jamu ciarpieć až da śmierci. Widziačy kryŭdnyja adnosiny polskaj duchoŭnaj ułady da litoŭskaha narodnaha adradžeńnia i hłyboka heta adčuwajučy, ks. J. A. u haračnaści serca swajho ŭ henaj katachizmoŭcy napisaŭ, što litoŭcy mahli-b słuchać tolki takoha biskupa, jakoha sami sabie wybrali b. Duchoŭnaja ŭłada jaho za heta zasuspendawała až pokul nie adkliča swaich pahladaŭ. Ks. J. A. hetaha nie zrabiŭ. Dzieła hetaha katachizmoŭka była ŭ Rymie ŭpisana ŭ indeks zabaronienych knižak.

Paśla hetaha ks. J. A. razam z dr. Basanowičam i inšymi litoŭskimi dziejačami zarhanizawaŭ „Sajuz dzieła zdabyćcia prawoŭ litoŭskaj mowie ŭ Katalickim Kaściele ŭ Litwie".

Apračа hetaha ks. J. A. wydaŭ polska-litoŭska-rasiejski słoŭnik, jaki tady byŭ badaj adzinym u litoŭskaj litaratury. Wydawaŭ taksama mnoha roznych knižačak haspadarskaha i ahulna-praświetnaha charaktaru. Asabliwa lubiŭ pčalarstwa i praz 1905 h. wydawaŭ miesiačnik „Litoŭski Pčalar". Paśla wydawaŭ časapis „Šviesa", u jakim wioŭ wostruju palemiku z palakami, praciŭnikami litoŭskaha adradžeńnia. Časapis hety wychodziŭ da 1909 h.

Ks. J. A. apračа hramadzkaj i kulturna-praświetnaj litoŭskaj pracy niamała patrudziŭsia i ŭ baraćcie dzieła zdabyćcia swabody dla litoŭshaj presy.

Pad kaniec žyćcia ks. J. A. złamany chwarobaj paralušu i suspensaj całkom byŭ adyšoŭšy ad hramadzkaha žyćcia. Prad samaj śmierciaj atklikaŭ tuju niaščasnuju katachizmoŭku i nanowa atrymaŭ prawy ksiandza, choć užo ŭsioroŭna wykonwać ich nia moh.

Pamior, majučy 60 h. Praz usio swajo žyćcio ŭsiudy dzie moh i jak moh pracawaŭ dla swajho rodnaha padniawolenaha narodu za jaho lepšuju budučyniu, pakładajučy ŭ hetym kirunku wialikija zasłuhi.

Dla nas biełarusaŭ z žyćcia ks. J. A. najbolš kidajecca ŭ wočy toj fakt, što jon najbolš paciarpieŭ ad duchoŭnaj polskaj ułady. I ŭ nas jość padobnyja achwiary, ale i jany, jak ks. J. Ambraziejus, jak mohuć i dzie mohuć kładuć swaje cahiełki ŭ wialiki budynak adrodžanaj i wolnaj Biełarusi.

P. Łuƀanowič.

240352

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА

Беларускі радыёканцэрт. 21-га лістапада ў віленскім радыё адбудзецца канцэрт беларускага хору пад кіраўніцтвам Р. Шырмы. Пачатак канцэрту в 16-й гадзіне 45 мінут. Трываць будзе 15 мінут. Перадавацца будзе на ўсе польскія радыёстанцыі.

Праграма: I. *Прыпеўкі і народныя танцы*: 1) Баба ракі варыла, гарм. Л. Рагоўскага. 2) Бульба, гарм. К. Галкоўскага. 3) Дзе ты хмелю зімаваў, гарм. Я. Нікольскага. 4 Лявоніха, гарм. К. Галкоўскага. II. *Вяселныя*: 5) Ня стой каліна, гарм. М. Равенскага. 6) Ой бяда ж мая, гарм. Т. Уладзімірскага. 7) Лучына-лучыначка, гарм. М. Анцава. 8) Конь бяжыць, гарм. Я. Грэчанінава. 9) Я ў полі вярба, гарм. Я. Сьвешнікава.

Пашырэньне Рэд. Калегіі „Шляху Моладзі. Даведываемся із нумару 12-га (за лістапад) „Шляху Моладзі," месячнага часапісу беларускай моладзі, што рэдакцыйная калегія гэтага часапісу пашырылася: у склад ейны уваходзіць цяпер 9 асоб, дасюль уваходзіла толькі 5 асоб. Гэтае зьявішча сьведчыць аб узросьце сіл і супрацоўнікаў у часапісе. Вітаем Адрас „Шл. Моладзі": Вільня, Завальная 1—2.

„Хто мы і дзе наша Бацькаўшчына"—гэта тэма рэфэрату, арганізаванага Віленскім Аддзелам Бел. Інст. Гасп. і Культуры. Рэфэрат прачытае др. Я Малецкі у залі Інстытуту (Завальная 1—1) дня 24.XI а гадз. 17. Уваход усім вольны.

Калосьсе. Беларускі літаратурна-навуковы часапіс. Кніжка 3-я ужо выйшла з друку. Зьмяшчае шмат цікавага і размавітага матэрыялу: — Багаты аддзел прыгожага пісьменства з Заходняй і Усходняй Беларусі. Артыкулы на тэмы гістарычныя. Вялікія аддзелы кнігапісу і хронікі. Каштуе асобная кніжка 1 зл. Прэнумарата ў год 4 зл., паўгода — 2 зл. Адрас рэдакцыі: Вільня, Завальная 1—2.

Даведываемся, што рыхтуецца ўжо кн. 4 я часапісу і мае выйсьці з друку яшчэ сёлета перад Калядамі.

Пастановы Бел. Касьцельнага Камітэту. Беларускі Касьцельны Камітэт у Вільні згодна з воляй агульнага сходу беларусаў каталікоў з дня 6.Х.35 г. на сваім паседжаньні дня 5.XI. пастанавіў: 1) праводзіць далей *рэгістрацыю беларусаў каталікоў у Вільні*; дзеля гэтага паведамляе беларусаў каталікоў, каб падавалі (найлепш у нядзелі па набажэнстве) сябром Б. К. Камітэту свае адрасы, імя і фамілію, век; і 2) зарганізаваць *рараты*, якія адбудуцца у трэцюю нядзелю адвенту (дн. 22 сьнежня) у касьцеле сьв. Мікалая а гадз. 7-й раніцы. Б К Камітэт просіць усіх зацікаўленых беларусаў да раратаў належна прырыхтавацца.

15-ці годзьдзе Бел. Студэнскага Саюзу. Беларускі Студэнскі Саюз у Вільні рыхтуецца ўрачыста адсьвяткаваць 15-годзьдзе свайго існаваньня. Дзеля гэтага арганізуе акадэмію, якая адбудзецца для 1-га сьнежня а гадз. 4-й п. п. у адной з заляў галоўнага будынку універсытэту. У гэты-ж дзень адчыніцца выстаўка беларускай студэнскай прэсы і выстаўка мастацкіх абразоў —плод творчай працы б. сяброў Бел. Студэнск. Саюзу (гр. П. Сергіевіча і інш.).

Асабістае. Гр. Алесь Яцына, сябра БХД, Бел. Інст. Гасп. і Культуры і іншых бел. арганізацыяў, аджаніўся з Ганнай Аусткальніт. Шлюб адбыўся дн. 14 г а г. м. у Немэнчыне пад Вільняй. Маладой пары зычым шчасьлівага радаснага жыцьця.

Uschodniaja Prusija — wajennaja baza.

Niamieckaja emihracyjnaja presa, što wychodzić u Paryžy, padaje: Paśla taho, jak hitleroŭskaja Niamieččyna sarwała z siabie wuzły wersalskaha traktatu, u sprawie wolnaha wajennaha zbrajeńnia, Uschodniaja Prusija pačała „ŭzbahačywacca" wajennaj siłaj — pajawilisia tam nowyja garnizony wojska azbrojenaha pawodle wymahańniaŭ wajennaj techniki apošnich časaŭ.

Hetyja garnizony wojska hatowy ŭžo, pa prykazu, pačać pachod u kirunku ŭschodu abo paŭdnia. Wielmi časta prybywajuć z centralnaj Niamieččyny ŭ Prusy celyja ešalony wojska i zbroi.

Pastrojeny tam nowaha typu wajennyja krepaści, składy dla amunicyi i prawijantu, špitali, schowy ad hazaŭ i pad.

Чытайце і пашырайце адзіны беларускі гаспадарскі часапіс „САМАПОМАЧ"! Пробныя нумары высылаюцца бясплатна. Адрас: Red. „Samapomač", Wilnia — Wilno Połackaja Nr. 9—4.

Polska-čechasławackija suadnosiny.

Suadnosiny Polščy z Čechasławaččynaj niasuładnyja. Niasuład hety paŭstaŭ dwa hady tamu, kali ŭ siaredniaj Eŭropie pakryŭsia chmarami palityčny niebaschił — kali niamieckaja palityka pačała rabić zachady ab złučeńni Niamieččyny z Aŭstryjaj, ci lepš skazać — dałučeńni Aŭstryi da Niamieččyny.

Hetyja zachady niamieckaj palityki paŭstrymalisia i, pakulšto, adnak napružanaść miž Polščaj i Čechasławaččynaj trywaje dalej i nie pasłablajecca. Biazumoŭna, hetaja napružanaść niebiespadstaŭnaja. Pryčyna hetkich susiedzkich suadnosinaŭ Polščy z Čechasławaččynaj znachodzicca ŭ dwuch haloŭnych punktach — na terytoryi čechasławackaj respubliki i ŭ mižnarodnaj palitycy.

Na terytoryi Čechasławaččyny, na Ciešynskim Šlonsku, jość palaki i polskaja ahulnaja apinija nia choča zhadzicca, kab u Polščy zabylisia ab tamašnich palakoch i nia cikawilisia ichnim tam pałažeńniem. Hetkaje ahulna polskaje zacikaŭleńnie čechasławackimi palakami wielmi niekarysnaje dla čechasławackaj palityki, jak unutry, taksama i na forumie mižnarodnym.

U mižnarodnaj palitycy Čechasławaččyna ad 1919 hodu stała trymajecca taje palityki, jakaja koncentrujecca ŭ Lizie Narodaŭ, — h. zn. trymajecca palityki Francyi, a Polš nie zachopliwajecca siłaj Lihi Narodaŭ i puściłasia na swaju sobskuju, asobnuju ad Lihi i Francyi palityku, spatkaŭšysia na hetaj linii z warožaj dla Čechasławaččyny, taksama i dla Francyi, Niamieččynaj.

Kali woźmiem pad uwahu pryčyny napružanaści susiedzkich polska-čechasławackich suadnosinaŭ i wajskowy dahawor Čechasławaččyny z Sawietami z adnaho boku i polska-niamiecki dahawor ab nienapadańni z druhoha, dyk pryčyna napružanaści ŭ polska-čechasławackich suadnosinach staniecca zusim jasnaj i zrazumiełaj.

Hetaja, adnak, čechasławacka-polskaja napružanaść suadnosinaŭ u miždziaržaŭnaj palitycy ciapier zusim nieaktualnaja i prachodzić u mižnarodnaj palitycy mała zaŭważanaj. Anhielska - francuskija dyplomatyčnyja zmahańni na mižnarodnym forumie ŭ sprawie italijanska-abisynskaj wajny ŭ Afrycy sapchnuli čechasławacka-polskija sprawy ŭ šery kutok. Polskija demonstracyi, jakija adbywalisia tydni dwa tamu prociŭ čechasławackaj unutranaj palityki adnosna pałakoŭ, i hromkija zajawy kiraŭnictwa čechasławackaj palityki ab niaźmiennaści stanowišča adnosna Polščy i na dalej — na mižnarodnym forumie nie dali nijakaha recha.

Słowam, polska-čechasławackaja napružanaść pieratwarajecca ŭ palityčnuju chwarobu chraničnuju i pastajanna dakučliwuju.

Hetkuju, ale bolšuju i ŭžo zadaŭnienuju, palityčnuju chwarobu polskaja palityka maje i z druhim susiedam — z Litwoj.

Ab polskaj zahraničnaj palitycy.

(*Z polskaj presy*).

Ab ciapierašniaj polskaj zahraničnaj palitycy ŭ hazecie „Polonia" nadrukawana apošnimi časami až niekalki artykułaŭ wydatnych aŭtaraŭ. Ab hetym nadrukawany, miž inšymi, artykuły hienerała Sikorskaha i St. Strońskaha — wiedamych znatakoŭ palityčnych spraŭ.

Hetyja artykuły, apisaŭšy metu i sposaby niamieckaj palityki, wyjaŭlajuć sučasnaje pałažeńnie polskaj zahraničnaj palityki, jakaja pradstaŭlajecca hetak.

Nawat Hdansk staŭsia prybudoŭkaj Niamieččyny i ŭžo pakazwaje zuby dla Polščy biazškodna dla siabie. Na Bałtyckim pabiarežžy dajšło da sajuzu Estonii, Łatwii i Litwy biaz učaścia Polščy. Dobrasusiedzkija suadnosiny Polščy z Sawietami, naładžanyja ŭ 1932 i 1933 h. dahaworami ab uzajemnym nienapadańni i ab adnazhodnaści razumieńnia napaśnika ŭ wajnie, apošnimi časami pieratwarylisia ŭ niedawierra, wyjaŭlenaje mnohimi dyplomatyčnymi cierciami, prykładam hromkaje ciercie ŭ Żenewie pałk. Beka — polskaha ministra zahraničnych spraŭ—z kamisaram Litwinawym — sawieckim dyplomatam.

Dalej, u hetych artykułach u „Polonii" ab polskaj zahraničnaj palitycy haworycca tak:

„Trudna spatkać horšych suadnosinaŭ, jak našyja z Małoj Antantaj, bo nawat Juhasławija niepakoicca polska-madziarskimi zalotami, z Čechasławaččynaj my na nažy, a z sajuznaj Rumynijaj taksama dziarom kata. Adnačasna sajuz z Francyjaj zusim biaz žyćcia, jakoje patrabuje dawieru."

Słowam — kiepska z usimi. Ale za toje ŭ zhodzie z Niamieččynaj, jakaja hatowicca da pachodu na ŭschod Eŭropy.

Dr. Stanisłaŭ Hrynkiewič.

Aświeta. 3)

(*Ab Narodnym Uniwersytecie i inšych sposabach aświetnaje pracy*).

IX. Biblijateki.

Časta biblijateka budzie adnoju amal što mahčymaściu šyrejšaje pracy aświetnaje. Chacia i tutaka sprawa nie kančajecca na tym, kab mieć knižki ŭ šafie. Mieć tawar ci mieć ziamlu, jašče nia značycca, što ŭsieńka zroblena, kab tawar dobra raspaŭsiudžywać ci kab ziamla dobra radziła. Heta tolki mataryjał, z jakoha možna ŭsieńka zrabić, kali ŭmieła ŭziacca za jaho.

Jość roznajakija typy biblijatekaŭ. Prykładam biblijateki *prywatnyja*. Ich amal nia majem u našych umowach biełaruskich. Nia majem my ani swaje buržuazii, nia majem tych słajoŭ u hramadzianstwie, jakija b mahli addać da šyrokaha karystańnia bahaćci swaich prodkaŭ ci zdabytych sobskaju natuhaju. Niekatoryja adzinki z našaje pracoŭnaje intelihencyi, jakija majuć krychu knižak, dzielacca imi pa miery mahčymaści. Henyja apošnija biblijateki nia majuć lišnie wialikaha hramadzkaha charaktaru dziela swaje małoje kolkaści i zusim prywatnaha charaktaru.

Najważniejšym typam biblijateki budzie *biblijateka hramadzkaja*, niezaležna ad taho, chto jaje naładziŭ, ci kulturnaja ŭstanowa, ci hramadzkaja, ci ekanamičnaja, ci adumysłowaja ŭstanowa z metaju arhanizacyi biblijatekaŭ. Najważnieŝy hety typ nia tolki dziela taho, što jon tolki i mahčymy ŭ nas, a što jašče ważniej, što pry hramadzkim charaktary biblijateki ździejśniajecca wielmi ważnaja starana ŭ biblijatecy, a mianoŭna mahčymaść *kirawać pracaju paasobnych adzinak cieraz prahramny padbor knižak*.

Meta biblijateki wielmi roznajakaja. *Škoła*, kali-b na't jana była swaja rodnaja, usiaho nia daść. U biblijatecy dalej ludzi ŭzhadowywajucca na swaju i baćkaŭščyny karyść. Biblijateka hetakmahčymaść dakončyć toje, što pačali kursy, leecyi paasobnyja ci systematyčnyja. Adnačasna mita biblijateki skałychnuć i wyklikać patrebu imknieńnia da aświety, dać ježu tym, u kaho naradziłasia patreba šukać strawy duchowaje, dać mahčymaść zdawolnić patreby nawukowyja.

Dziela roznych miarkawańniaŭ byli arhanizawanyja *roznyja typy* biblijatekaŭ. Siańnia typ biblijateki, jak niejkaje kuchni dziela praletaryjatu duchowaha, naležyć da minuŭščyny. Bačyli my ich u siabie ŭ paru paśla 1905 hodu, kali ludzi mo' i z dobraju dumkaju, adnak nie razumiejučy patrebaŭ šyrokich masaŭ, išli na wiosku z knižkami maralnymi, pabožnymi, cikujučy ab patrebie „dušy", nia dumajučy i nie razumiejučy zusim patrebaŭ biahučaha dnia. Da taho ž u nas henyja biblijateki najčaściej byli čužymi i źmiestam i nastrojem, što łunaŭ ad henych knižnic. Najčaściej arhanizawaŭ heta ksiondz, pani ci panienka z susiedniaha dwara. Nie wyklikali henyja knižnicy masawaje pracy, nie pašyrylisia jany zašmat. Zatoje wielmi časta zabrali bolš žywych adzinak i papsawali ich u niekatoraj miery, dziela taho, što aświeta hetkaja adłučyła ich ad hramady, wykasawała ŭ niekatoraj miery z supolnaści, pryščapiŭšy čužyja asiarodziŝču dumki i idei.

Niel Sapraŭdnaja, dobraja biblijateka nia budzie takoju. Jana ŭzhaduje hramadzianina świedamaha, adkaznaha za siabie i za swaju rolu pierad historyjaju. Akančalna kožny z nas heta ŭ niekatoraj miery budaŭničy padziejaŭ swaich i swajho narodu.

Kazać u nas siańnia ab wybary knižak, ab układańni katalohu, chacia sprawa wielmi i wielmi ważnaja, dawoli trudna. Kožnaja našaja knižnica miecimie bolš-mienš toje, što možna dastać u rodnaj mowie. Charaktar tady biblijateki wyznačajecca nasampierš tym, što jana *biełaruskaja*. Cieraz biblijateku čytač chaj nawučycca ŭsiaho, ab *swajoj staroncy*, ab *jejnaj minuŭščynie*, ab *jejnym prastory*, ab *nasielnictwie*, ab *słaŭnych zmaharoch*, ab *šlachoch, jakimi ludzi chadzili, majučy na ŭwiecie dolu swaich*. Cieraz biblijateku treba, kab čytač moh znajści kantakt z šyrokim świetam, kab lepš moh zrazumieć swajo pałažeńnie kab lepš moh ujawić, pašto i našto toje ŭsieńkaje, što bačać jahonyja wočy.

Niezaležna ad kolkości i jakaści knižak, treba kab byŭ u biblijatecy zaŭsiody kataloh. Kataloh — heta pakazalnik imknieńniaŭ i mahčymaściaŭ kiraŭnictwa biblijateki.

Biblijatekar wielmi ważnaja asoba. Ad jaho šmat zaležyć, jakija knižki buduć čytać, ad jaho zaležyć, jak buduć čytać. Čytać knižki treba nawučycca. Nasampierš treba wyhadawać henych biblijatekaraŭ. Jak ich nojdziem, jak damo im nawučycca swajho „ramiasła" — heta sprawa, jakuju zmoža wyrašyć tolki masawaja arhanizacyja kulturna-aświetnaja. Pakiniem henyja razważańni ciapier na staranie.

U suwiazi z našymi ŭmowami možna było-b padumać nad adnoju mahčymaściu padychodu da pytańnia biblijatečnaha, heta mianoŭna arhanizujučy *biblijateki wandroŭnyja*. Na terytoryi, skažam pawietu ci akruhi, dzie niama mahčymaści sarhanizawać bolšaje kolkaści centraŭ biblijatečnych, naładžywajecca biblijateka, jakaja razjažđžaje ŭwieś čas i ŭ dadzienuju miascowaść źjaŭlajecca raz na miesiac, ci jak dawiadziecca pawodle raspracowanaha planu. Tyja, što pračytali knižki, addawacimuć ich nazad i buduć brać nowyja. Biblijatekar-ža sa swaimi knižkami konikam, ci dwuchkołkaju ci jak jašče jano, jedzie dalej.

Dziela hetkaje biblijateki nia było-b takoha hłuchoha kutka, dzie-b jana nia łučyła, biazumoŭna trymajučysia swaje akruhi, inakš knižki chutka raspaŭźlisia-b uščent. Biblijateka treba kab mieła prynamsia duplikaty abo na't patrojnyja ci pa 5—7 ekzemplaraŭ bolš chodkich knižek, inakš nie absłužyła-b jana swaje akruhi.

U biblijatecy henaj treba mieć wielmi adkaznaha pracaŭnika. Heta praca dziela čaławieka achwiarnaha, idejnaha, z nachiłam da hramadzkaha žyćcia. Najbolš pažadana, kab heta byŭ čaławiek „swoj", rodam z terytoryi, dzie pracawacimie.

Sialanskaja rewalucyja ŭ Hrecyi.

Jak u nas ziemlarobstwam, tak u paŭdzionnaj Hrecyi sialanie zajmajucca plantacyjaj winahradu. Ceny na winahrad sioleta nadta panizilisia, tak što nieapłačywali nawat raboty źbirańnia winahradu. Z pryčyny hetaj u paŭdzionnaj Hrecyi pačalisia sialanskija bunty, a paśla i rewalucyja. Na syhnały wybuchu dynamitu i strełaŭ, tysiačy sialan wystupili z aružžam u rukach i zaŭładali niekatorymi miastečkami i haradami. U miastečku Pigasos sabrałasia bolš 1500 sialan i kali jany słuchali swaich pramoŭcaŭ, nadjechaŭ addzieł palicyi. Sialanie ščylna akružyli palicyju, razaružyli jaje, a palicejskaha aficera zabrali ŭ pałon, jak założnika. Dalej, manifestanty źniščyli hałoŭny budynak uradawaj instytucyi, jakaja kirawała handlam winahradu. Paśla sialanie ščylnymi radami akružyli budyninu Narodnaha Banku i chacieli jaho padpalić. Banku ściaroh wialiki atrad žandarmeryi. Rewalucyjaniery z žandarami pačali krywawuju bojku. Pamima taho, što sialanie mała mieli aružža, adnak pa 15-cihadzinnaj „wajnie" z žandarami byli blizkija pieramohi. Ale nadyjšoŭ addzieł wojska, jaki razam z žandarami i palicyjaj raźbiŭ sialanskija rady.

U wyniku hetaj bojki było kala 20 zabitych z abudwych staron i bolš jak hetulki ranienych.

Historyja nia šmat maje sialanskich rewalucyjaŭ, ale hety nie adasobniehy fakt świedčyć, što i sialanie ŭmiejuć baranić swaich intaresaŭ.

Roznyja wiestki

Z UKRAINSKAHA ŽYĆCIA.

Ukrainski Pedahahičny Kanhres. U dniach 2 i 3 listapada sioł. adbyŭsia ŭ Lwowie pieršy Ukrainski Pedahahičny Kanhres, jaki byŭ naładžany Hałoŭnaj Uprawaj T-wa „Ridna Škoła".

Paśla referataŭ i dyskusii Kanhres pryniaŭ rezalucyi, u jakich, miž inšym, pastaŭleny hetkija damahańni:

Prawa na nacyjanalnaje ŭzhadawańnie moładzi. Dla ukrainskaj moładzi ukrainskaja mowa i ukrainski wučyciel.

Skasawańnie ŭtrakwizmu ŭ škołach. Žyćciowaje pastanoŭski škoły.

Nawukowamu T-wu im. Šeŭčenki daručana pačać starańni ab utwareńni ukrainskaha ŭniwersytetu.

Ahułam, uražańni hetaha Kanhresu wielmi sympatyčnyja; jany wypływajuć z jaho dzieławych pastanoŭ.

Tajnyja arhanizacyi nacyjanalistaŭ u Saw. Ukrainie. Niamieckija hazety padajuć, što ŭ Kijawie wykryli niadaŭna tajnyja arhanizacyi ukrainskich nacyjanalistaŭ, jakija prawodzili enerhična swaju nacyjanalnuju rabotu i separatystyčnuju prapahandu. Adna arhanizacyja, što dziejała ŭ Donbasie, składałasia wykľučna z rabotnikaŭ a druhaja składałasia z wučycialoŭ i studentaŭ.

Z POLŠČY.

Nadzwyčajnaja sesija Sojmu i Senatu zakryta. Dnia 7 h. m. dekretam Prezydenta nadzwyčajnaja sesija Sojmu i Senatu zakryta.

Zwyčajnaja-budžetnaja sesija zakonadaŭčych pałataŭ maje być sklikana pad kaniec hetaha m-ca.

Dekrety ŭ sprawach skarbowa-dziaržaŭnaj aščadnaści Rada ministraŭ pryniała 5 dekretaŭ, jakija datyčać zroŭnawažańnia budžetu i ažyŭleńnia haspadarčaha žyćcia. Paimienna: 1) ab padatku ad pensijaŭ čynoŭnikaŭ i służačych, 2) u sprawie nowelizacyi zakonu ab acharonie lokataraŭ, 3) ab padatku ad pamieškańniaŭ, 4) ab naprawie haspadarki samaŭradawych sajuzaŭ, 5) u sprawie źmieny zakonu ab palohkach dla kredytowych ustanoŭ, jakija pryznajuć daŭžnikom palohki ŭ halinie ziemlarobskaj.

Asobny padatak buduć brać wypłačywajučy pensii čynoŭnikam i słužačym. Ad pensii nia bolšaj 100 zł. padatku nia budzie. Ad wyšejšych jak 100 zł. padatak raźmierany hetak: ad 101 da 150 zł. — 7 proc., ad 150—200 zł. — 9 proc., ad 200—250 zł. — 10 proc., ad 250—500 zł. — 11 proc., ad 500 — 1000 zł. — 14 proc., ad 1000 — 2000 zł.—17 proc., ad bolš, jak 2000 zł. — 25 proc.

Padatak hety majuć zyskiwać ad 1 śniežnia 1935 h. da 1 śniežnia 1937 h.

Niezadoŭha maje być wydana nastupnaja seryja padobnych dekretaŭ.

Polskija čynoŭniki ŭ daŭhoch. Prawiedzienaja Sajuzam Dziaržaŭnych Čynoŭnikaŭ ankieta ab zadoŭžańni čynoŭnikaŭ wykazwaje, što čynoŭnictwa maje doŭhu mienš bolš 75 milijonaŭ zł., a kožny čynoŭnik — kala 1.375 zł. Z pamiž usich čynoŭnikaŭ nia majuć doŭhu tolki 8 procantaŭ ludziej, rešta ŭsie ŭ daŭhoch.

Słowam, polskaje čynawiectwa biednaje, ale siarod jašče biadniejšaha rabotnictwa i sialanstwa jano stanowić u Polščy klasu zamožnuju, z katoraj ciapier i nowy padatak buduć brać.

Abnižka čyhunačnaj taryfy. Pa Nowym Hodzie maje być abnižana čyhunačnaja taryfa — pasažyrskaja i tawarnaja.

Zwalnieńnie z służby zamužnich žančyn. Ad 1 h. m. pačali zwalniać z kazionnych pasadaŭ zamužnich žančyn, katorych mužy służać u kazionnych instytucyjach.

Polskija emeryty. U Polščy nadta mnoha dziaržaŭnych emerytaŭ, jakim dziaržaŭny skarb wypłačwaje pensii. U 1934 h. było 179546 emerytaŭ, u hetym liku 151055 emerytaŭ z časoŭ paŭstańnia Polščy, a rešta staryja — z časoŭ Rasiei, Aŭstryi i Niamieččyny. Najbolš emerytaŭ čyhunačnych — 70612, wajskowych — 17331.

Źmieny ŭ administracyi. Hazety pišuć, što ŭ polskaj dziaržaŭnaj administracyi buduć wialikija źmieny na wyšejšych stanowiščach. U suwiazi z hetym maje być naznačany ŭ Biełastok na wajawodu b. u Wilni wicewajawoda Kirtiklis.

Amnestyja. Hazety padajuć, što prajekt amnestyi ŭžo hatowy i budzie pastaŭleny na paradak dnia budžetnaj sesii Sojmu, jakaja pačniecca ŭ hetym miesiacy.

Amnestyja abymaje prastupstwy palityčnyja i kryminalnyja. Kary da 3 hadoŭ turmy za prastupstwy palityčnyja źmienšanyja buduć na paławinu, kary da paŭtara hodu wastrohu buduć zusim darawanyja. Za prastupstwy kryminalnyja kary da paŭhodu turmy buduć zusim darawanyja, a kary pa hodu turmy buduć źmienšany na paławinu.

Kary hetaj amnestyjaj nia buduć darawany: za prastupstwy ŭ hałasawańni ŭ sprawach hramadzkich, za padrobliwańnie hrošaj, za ŭładžańnie raspusty, za zniesłaŭleńnia ŭ druku, za prastupstwy z dziaržaŭnaj stratąj, za handal narkotykami, za biaspraŭnaje trymańnie aružža, za prastupstwy prociŭ biaśpiečnaści dziaržawy, za skarbowyja i wajskowyja prastupstwy.

Amnestyja pačnie abawiazywać paśla pryniaćcia jaje Sojmam i Senatam. Abymać jana maje prastupstwy, katoryja byli dakananyja da 23 krasawika 1935 h., a tak ža i prysudy, jakija ŭ hetym časie wydany i jašče niewykananyja.

Pierad sudam za zabojstwa min. Pierackaha. U Waršawie pačniecca 18 h. m. sud za zabojstwa ministra Pierackaha. Sudzić buduć 12 maładych ukraincaŭ.

Hazety padajuć, što ŭ Waršawie wielmi wialikaje zacikaŭleńnie hetym pracesam.

Z ZAHRANICY.

Z frontu wajny ŭ Afrycy. Wajna miž Italijaj i Abisynijaj usilajecca. Italijancy nastupajuć i prabirajucca ŭhłyb Abisynii. Abisyncy herojska baroniacca i, bywaje, dobra pabiwajuć italijancaŭ. Nadowiačy ŭ adnoj bitwie abisyncy adabrali ad italijancaŭ 6 tankaŭ i ŭziali šmat pałonnych, pierawažna Somalisaŭ, jakich italijancy zmabilizawali ŭ Afrycy i pahnali na wajnu.

Hazety padajuć, što ciapier hatowiacca i italijancy i abisyncy da wialikaj bitwy.

Wincuk Adwažny.

Hanuliny kłapoty [1)]

I.

U dalokaj Arhientynie
Žywie Janka na čužynie.
Świet wialiki, kraj daloki,
A tam Janka adzinoki.
Ludzi tyja ŭsie admienny;
Tam paradki niejki drenny;
Śmiešna ichniaja haworka —
Jazyk skruciš, ŭ hubie horka.
Zimoj dušna ad śpiakoty,
Letam zimna. A raboty
Usiudy mała: nuda, hora...
Wyliŭ potu cieła mora.
I dušu jaduć zhryzoty;
Dyk saŭsim niama achwoty
Pracawać tak adwarotna:
Žyćcio Jankawa harotna
Ŭ wioscy žonka astałasia,
Syn Paŭluk, dačka Michasia;
Chata biedna, doŭhu mnoha —
Adno horal bolš ničoha.
Žoncy imia było Hanna;
A Michasia — užo panna;
Paŭluk takža małajčyna —
Let trynaccaci chłapčyna.

Janka płača tam za moram;
Žonka tut prybita horam.
Treci hod žywie ubohi.
Kładzie niejkija darohi —
To čyhunki, to šašejny —
Los adnak-ža bieznadziejny.
Čorny woł nia tak pracuje:
Z bolu ŭžo kaściej nia čuje.
Płača Janka tam za moram,
Žonka tut prybita horam.

Pośle rezaŭ na kanserwy
Miasa z niejkaj hadkaj ścierwy;
Masła biŭ, daiŭ karowy:
A to ŭ lesie ciahaŭ drowy,
Spuščaŭ belki, rwaŭ kareńni;
I najeŭsia roznaj dreni.
Pośle byŭ na parachodzie,
Pry katłoch, na samym spodzie:
Jak u piekle, ŭ sažy, ŭ mazi;
Jak zły duch ŭ mašynach łazie.
Ale ŭsiudy los karotki:
Drenny ŭsiudy zarabotki.

Płača Janka tam za moram,
Žonka tut prybita horam...

II.

Dalš nia mohučy ściarpieci,
Piša Janka: „Žonka, dzieci,
Žywa ŭsio papradawajcie,
Ŭ Arhientynu pryjaždžajcie!"
Skočyć Hanna, copam-łopam
Dzieła sprawiła halopam:
U paśpiechu, jak papała,
Skora ŭsio papradawała.
Janka hrošy na darohu
Prysłaŭ dosić, dziakuj Bohu!
Dyk z susiedziami, z žydami
Raspłaciłasia z daŭhami.
Bačyć baba na astatku,
Što papiery nie ŭparadku;
Bo — ni sieła, ani pała —
Paŭła metryka prapała!

A tutejšy arhanisty
Duža byŭ fanabarysty.
Hanna-baba, toj nia dziwa —
Była wielmi bajaźliwa.
Pryšła, biedna, až trasiecca,
Tak pakorna adaźwiecca:
„Moj panočku, ci hatowa
Ta papiera Paŭlukowa?"
— „Ty ab metryku pytaješ?
Ja-ž kazaŭ — sama ty znaješ:
Pierabraŭ ja cełu knihu —
Mnie zapłaciš za fatyhu —
Niama metryki i kwita!"

Staić baba z tropu źbita,
Što rabić, sama nia znaje;
Dyk jašče raz zapytaje:
„Moža, pan, hladzieŭ nia ščylna?
Hlań jašče, dy bolej pilna!
Zapłaču pa dobraj zhodzie..."
Arhanistaha łahodzie —
Baba j płača, ščyra prosić,
Na kwateru ŭsiu hałosić.
Kab ad płaksy adčapicca —
Z babaj-ža nia budzieš bicca! —
Arhanisty staŭ kapacca;
„Pilna-ščylna" pryhladacca;
Imia, proźwišča pytaje,
Kožnu kartku razhladaje...
Až znajšoŭ! i sam ździwiŭsia:
Pračytaŭ i .. z tołku źbiŭsia —
Usio zapisana sumlenna,
Tolki imia jość admienna.
Bo u knizie zamiest syna
Pišacca dačka — „Paŭlina."
Arhanisty zaśmiajaŭsia,
Tak da Hanny adazwaŭsia:
„Ma—być jon dačkoj radziŭsia?
Pośle ŭ chłopca admianiŭsia..."
Hanna kaža: „Boh razsudzie,
Heta-ž znajuć usie ludzi,
Što jon chłopiec, nie dziaŭčyna:
Syn Paŭluk, a nie Paŭlina.
Kali-ž imia nie takoje,
Napišy, panok, druhoje!"

— „Što naprasna tut bałtaješ?
Durań-baba, ty nia znaješ:
Što napisana piarom,
Nie adrubiš taparom.
Lepš idzi ty, babka, z Boham!
Što staiš tut pad paroham?
A za ŭsie maje kłapoty
Zapłaci mnie paru złoty."

Baba płača až kanaje,
Arhanisty to-ž nia znaje,
Što rabić. „Waźmi choć hetu," —
Pačaŭ ciešyć jon kabietu, —
Kaža: „metryku Paŭliny:
Z joj idzi sabie da hminy.
Paturbujsia, pastarajsia,
Abo probaršča spytajsia."

III.

Hanna wyjšła, pastajała
Na dware, parazważała,
I da probaršča zachodzić;
Swaje žali tut razwodzić.
Probaršč słuchaŭ, słuchaŭ, słuchaŭ
Až patylicu pačuchaŭ.
Pośle kaža: „Sprawa pilna:
Pisać treba až da Wilni —
Prasić biskupa samoha,
Treba, kaža, dzieła toha,
Kab razważyć sprawu račyŭ
I mianie suddzioj naznačyŭ.
Na try złoty marak ŭlepiš
I da prośby toj pryčepiš.
Prywiadzieš siudy mnie świedkaŭ
Ci susiedaŭ, ci susiedkaŭ;
Pad prysiahu ich pastaŭlu
I jašče papierku spraŭlu;
Tahdy ŭsio pašlu da Sudu
I prasić tam krepka budu,
Kab skarej zakončyć sprawy."

—„Skažy, probaršč moj łaskawy,
Ci to dzieła skora budzie?"
— „Pačakaješ, tak jak ludzi:
Niadziel piać, ci moža bolej."
Baba, skrušana niadolaj,
Nawat płakać bolš nia moža.
—„Ci-ž, ksiandzok, mnie nie pa-
[moža?
Tak praboršča zapytała:

„Ja-ž saŭsim ciapier prapała!
Mnie za tydzień treba jechać,
A Paŭluk moj, jak toj wiechać,
Pierakručany ŭ Paŭlinu;
Musić ja da rešty zhinu!"
Ksiondz i tak i siak joj radzić,
Ale z babaj nie pauładzić:

„Trudnaść, kaža, tut fizyčna,
Pieraškoda kananična.
Jak zrabić, ja sam nia znaju:
Kompetencyi nia maju.
Bo ustawy kananičny
Hety kwestyi metryčny
Jašče letaś ŭ hetu poru
Pieranieśli ŭ Kansystoru."

Hanna biedna až zdrantwieła,
Bo saŭsiom nie zrazumieła.
Ksiondz tłumačyŭ, nerwawaŭsia
Dobra wyjaśnić staraŭsia;
Baba mocna uzdychała,
Haławoj swajej kiwała...
Choć tłumačyŭ wielmi mnoha,
Nia uciamiła ničoha;
Dyk staŭ radzić usio-čysta,
Jak kazaŭ joj arhanisty:
„Sama bačyš—my nia winny,
Dyk idzi sabie da hminy!"

IV.

U hminie Hanna raskazała,
Jak-to metryka prapała,
I jak z chłopca, jaje syna,
Była zroblena „Paŭlina."
Babu ŭ hminie abśmiajali,
Pośle dźwiery pakazali.

Wyjšła baba čuć žywaja;
Była strašnaja, bladaja.
Storaž kaža: „Što z taboju?
Musić drennaju paroju
Ty pryjšła? Wady napisia
I sama krychu abmyjsia —

Krywawyja demonstracyi ū Ehipcie. Nadowiačy ū Ehipcie byli krywawyja zabureńni, jakija pakazwajuć, što tamašniaje nasielnictwa ciažka adčuwaje panawańnie nad saboju anhielskaj ułady. Ehipieckija demonstranty ū bojcy z anhielskaj palicyjaj pabili 45 palicejskich, spalili palicejski aūtamabil i adzin motocykl.

„Hitler hatowicca da napadu na Ukrainu." Padčas balšawickaha świata 18 tych uhodkaū rewalucyi, u Maskwie adbyłasia wialikaja wajskowaja demonstracyja. 60.000 nawabrancaū sawieckaj armii pryniali prysiahu wierna służyć i baranić Sawietaū. U hetym časie Hitler u Berlinie słuchaū, pieršaj pašla wajny, prysiahi niamieckich nawabrancaū, jakija prysiahali słuchać kamandy i być stojkimi sałdatami niamieckaj armii. Pašla „parady" kamisar Worošyłaū skazaū pramowu, u jakoj ćwierdziū, što Hitler hatowicca da napadu na Ukrainu.

Relihijny ruch u Sawietach. Usim wiedama, što ū Sawietach niama swabody dzieła raźwićcia relihijnaha žyćcia. Adnak relihijny ruch tam prajaūlajecca. Balšawickija hazety padajuć, što relihijniki raspaūsiudžwajuć nabožnyja knižki i inšuju litaraturu relihijnaha źmiestu. Rabota heta tajnaja i wielmi šyrokaja—abniaty relihijnym rucham i kolektywy.

Z KRAJU.

Horadnia. Sud za prociūžydoūskija zabureńni zakončyūsia. Winawatyja zasudžany: Panasiuk na 1 hod turmy, Kazłoūski, Marcinčuk i Zygmanski pa 9 miesiacaū turmy, Žukaū, Moždzer, Bielski, Jarašewič, Ramančuk i Płocki pa 6 miesiacaū. Rešta abwinawačanych apraūdanyja. Prakuror hetym prysudam nie zdawoliūsia i zajawiū, što padaje apelacyju.

Zabastoūka. Nadowiačy 740 rabotnikaū fabryki dykty pašla 6 tydniowaj zabastoūki pačali pracawać. Rabotniki damahajucca padwyžki zarabotnaj płaty. Sprawu maje razhladzieć specyjalnaja kamisija. Hetak rabotniki zmahajucca z wyzyskam.

Biełastok. Haradzkija służačyja prabujuć baranić swaich intaresaū, jakija zahrožany abnižkaj pensii i ūwadzieńniem padatku ad pensijaū.

Piśmy z wioski.

Jak nazwacca?

Z troch namiečanych nazowaū, dzieła pierajmienawańnia B.Ch.D., padanych u kamunikacie Prezydyjumu C.K. BCh.D., ja padaju swoj hołas za nazoū „Biełaruskaje Narodnaje Radykalnaje Abjednańnie."

Na moj pahlad, radykalizm u našaj abnoūlenaj arhanizacyi pawinien być i ū nazowie.

Nazoū „Biełaruskaje Narodnaje Abjednańnie" niešta niawyraznaje. Nazoū „Biełaruskaja Redykalnaja Partyja" niešta wuzkaje — partyjnaje.

Biełaruskaje sialanstwa i rabotnictwa ciapier uspasoblenyja nadta radykalna i na razdrableńni partyjnyja hladzić z pahardaj. Ciapierašnija nastroi wa ūsich biełarusaū adnolkawyja — nacyjanalna-sacyjalna wyzwolnyja.

Dzieła hetaha treba zrabić adpawiednuju nastrojam sialan i rabotnikaū prahramu abnoūlenaj arhanizacyi i adpawiednaje jaje nazwać.

Siabra B. Ch. D.

Da abnowy B.Ch.D.

Mnoha pisali ab abnowie BChD. i jašče chiba buduć pisać, bo-ž centralnyja ūlady hetaj arhanizacyi prosiać ab hetym pisać. Praūda, heta sprawa ważnaja, dyk i ja napišu swaje zaūwahi.

B.Ch.D. ciapier, badaj, adzinaja dobra zarhanizawanaja palityčnaja arhanizacyja ū Zach. Biełarusi. Praūda, jana nia „kryčała" i nia „kryčyć" na druhich i nie abiacała i nie abiacaje „zorawa ū niebie" za padtrymańnie jaje, abo za hałasawańnie za jaje siabroū, ale jana cicha, spakojna, pastupova prawodzić swaju prahramu ū žyćcio i hetkim sposabam nadta mnoha zrabiła i šmat robić.

Ja nia lublu ani krykliwych ludziej, ani krykliwych nazowaū, bo heta świedčyć ab ichniaj słabaści abo pustacie. Tolki toj kryčyć, što na nahach słaba staić i kryčyć dzieła taho, kab nie pawalicca. Dyk nie ū nazowie sprawa abnowy BChD., a ū sapraūdnym abnaūleńni.

Ja pryznajusia, što mnie asabista ūsie try nowyja nazowy dla abnoūlenaj B.ChD., padanyja ū adzywie Prezydyjumu C.K. B.Ch.D., nie padabajucca, ale, na moj pahlad, na ciapierašnija časy najbolš padchodzić „BNA."

Na moj pahlad arhanizacyja nie samameta, a sposab da mety — arhanizacyja nie na toje, kab najbolš zapisałasia ū jaje ludziej siabrami, ale na toje, kab jana ū narodzie rabiła namiečanuju rabotu. Dzie kryčać, tam najmienš robiać. Dyk rabiem my biełaruskuju rabotu biaz kryku i ū abnoūlenaj B.Ch.D.

Dziejny siabra.

Ужо выйшла з друку кніжка 3-цяя
„КАЛОСЬСЯ"
ЗЬМЕСТ

1. Хведар Ільляшэвіч: — „Васеньняя поэма", „Зацьвітай, родны край", „Па вёсках Беларусі" (вершы); 2. Міхась Машара: „Вясьнянкі", „Сёмуха", „Не хвалюй майго сэрца"..., „Знаю, знаю"..., „Едзе шпарка там хтось па дарозе" (вершы); 3. А. Бярозка: — „Ноч ідзе", „Вось ізноў плачуць струны гітары тваей" (вершы); 4. Сымон Баранавых: — „Прысады" (апавяданьне); 5. Ул. Дубоўка: — „Пачынаецца з пад хмар вандроўных", „Паляжам мы", „Можаце лаяцца", „Ня можа абыйсьціся бяз лірыкі" (вершы); 6. Ст. Станкевіч: — „Беларускія філёмацкія вершы Яна Чачота"; 7. В. Гадлеўскі: — „Стагодзьдзе новага беларускага друку"; 8. Ул. Талочка: — „Да справы веравызнаньня Фр. Скарыны"; 9. Др. Ст. Грынкевіч: — „З зацемак аб тэатры"; 10. Кнігапіс; 11. Хроніка.

Выпісывайце і пашырайце „КАЛОСЬСЕ". Прэнумэрата: у год 4 зл., паўгода — 2 зл., асобная кніжка — 1 зл. Адрас рэд. і адм. „Калосься": Вільня, Завальная 1—2.

„Калосьсе" — адзіны ў Заходняй Беларусі літаратурна-навуковы часапіс — квартальнік. „Калосьсе" павінна быць настольным часапісам у кожнага сьведамага беларуса, у кожнага беларускага інтэлігента. Да супрацоўніцтва ў ім рэдакцыя заклікае ўсе жывыя беларускія сілы.— Рыхтуецца да друку ўжо кніжка 4-я часапісу. Рэдакцыя просіць супрацоўнікаў найхутчэй прысылаць да друку матэр'ялы, якія сваей формай і зьместам адпавядалі-б часапісу.

Рэдакцыя «КАЛОСЬСЯ».

Kuplajce!

ūsio piarojdzie." Staū joj radzić,
Daū wady, na kresła sadzić;
Starażycha pamahaje
Wiski Hańnie adciraje;
Dyk adrazu pałachčeła.
„Nu, skažy: jakoje dzieła
Ty da Wojta ū hminie maješ?"
—„Ach,panok moj, ty nia znaješ,
Jak mnie trudna: ja-ž kabieta —
Tak i tak, i toje—heta..."
Storaž słuchaū, a paroju
Kiwaū łysaj haławoju.
—„Oj, paznaješ, kaža, hora,
Pakul wyjedzieš za mora!
Čaławiek żywieš na sušy
I to hora až pa wušy;
A ty chočyš zahranicu,.
Wypraūlali tak sinicu
Cely hod, ci moža bolej,
Nie sabrałasia nikoli!"
Tak paciešyūšy niaščasnu,
Storaž pośle swaju ūłasnu
Raskazaū biadu Hanuli:
Jak jaho tut ściebanuli
Pisar z Wojtam; jak haniali,
Jak i płakać nie dawali.
Jak na Wojta imianiny
Pili — jeli; z całaj hminy
Pazjaždžalisia hulaki.
Takža inšy sprawy ūsiaki.
Pośle kaža: „Ja bajusia,
Z Wojtam ci dahawarusia?
Tut paradak wielmi drenny.
Storaž ja pieradwajenny.
Ciapier, praūda, što biaz miery
Zawiałosia tut papiery;
Ū tych papierach, jak u lesie,
Zbłudziš ū ważnym intaresie.
Daūniej mała što pisali,
Ale bolej praūdy znali!
Mnie tut dobra nasalili:
Nawiet pensiju skrucili.
Dobra i heta! Što-ž ty zrobiš.
Choć na chleb sabie zarobiš.
Jak toj kaža: Chleb trajaki —
Biely, čorny i nijaki..."

V.

Ducham paūšy, jak prybita,
I paplakaūšy dasyta,
Hanna ū wiosku paplałasia.
Ū wioscy baśnia razyšłasia,
Jak raście na droždžach ciesta,
Pryšła zaūtra až u miesta:
Što ū Hanuli syn fałšywy.
Ū druhoj wioscy inšy dziwy
Płatuć baby: što zaspany
Arhanisty byū, ci pjany,
Jak pisaū u tuju knihu:
Zamiest litar widzieū fihu!
Wot i wyjšła ciapier štuka
I dla matki tož nawuka;
Bo to treba aściarožna:
Kumoū pjanych brać nia možna,
Kab praūdziwa padawali —
Chłopca dzieūkaj nia pisali...
Jašče inšy na astatku
Ūziali dziūnuju dahadku;
Kažuć: „Časam tak bywaje —
Boh kiarunak pamiašaje:
(Heta musić wielmi drenna?)
Płeć bywaje pieramienna...
A, jak Hanna naradziła,
Babka doūha warażyła
I hadała tak na dwoje:
Što tut za dzicia takoje?
I katora paławina:
Ci to chłopiec, ci dziaūčyna?"
Tak bałtała Aližbieta,
Sprawiadliwaja kabieta,
Što ad babki pad sakretam
Čuła praūdu ūsiu ab hetym.
Ad kumoški da kumoški
Pajšoū sekret na ūsie wioski.
Što-ž karyści u tych sporach,
Ū pustych babskich razhaworach?
Wiecier wieje, sučka breša,
Jazykom bałtucha češa...
Z hetych płotak ūsiej karyści,
Jak toj kaža: „ani zhryści!"
Wot Hanula u tym hory
Zatanuła, jak u mory;
U tym płaču, u frasunku,
Biez paciechi, biez ratunku,
Jak-by ryba ab lod bjecca
I nia znaje, hdzie padziecca..."

VI.

Čaławiek adzin nabožny
Zajšoū ū chatu — padarožny.
Jak pačuū jon razhawory
Ab Hanuli ciažkim hory,
Babie radzić staū pa-družbie:
„Byū ja, kaža, kaliś ū służbie,
Hdzie Kitajec biūsia z Chinam,
Byū ja ūžo wialikim čynam.
Na wajnie byū, na pachodach,
Ū roznych, kaža, byū pryhodach,
Dyk paradžu, tak jak treba.
Mnie dasi kusočak chleba,
A sama zrabi woś hetak:
Ciapier maješ dwoje dzietak...
Nia puskaj sakretu z chaty —
Niachaj buduć dźwie dziaūčaty!"
—„Jak-to?" —Hanna zapytała.
„Mnie dasi kusočak sała,
A z chłapca zrabi „Paūlinu:"
Adzień Paūła za dziaūčynu."
Baba stała sumniawacca.
—„Tut niama čaho bajaccal"
Kaža dzied:—„Zrabi sakretna—
Adzień syna niezamietna:
Pierarobiš na dziaūčynu,
Tady prosta wali ū hminu!
Jak z dziaūčynaj ū hminie stanieš,
Zara „dowida" dastanieš.
Bo u kožnaj, bač, pryhodzie
Treba być z papieraj ū zhodzie.
A jak zhubiš hdzie papiery,
Biada horša ad chalery!
Ciapier časy, bač, lichija
I načalniki takija:
Jak papiery hdzie pasiejuć,
Zrabić nowych nia umiejuć.
Ū hetych časach žyć pabožna
Choć zareź! saūsim nia možna.
A jak šelma maje hrošy,
Jaho chwalać — jon charošy.
A ty chočaš žyć učciwa,—
Dyk papieryna fałšywa
Ciabie wywiedzie u poła...
Ech ty, dola, horka dola!...
A što „dowid" toj pamoža?
Ach ty mocny, światy Boža!
Chto kruciel, toj biez pakuty
Daścia za try minuty.
A ty, baba, niawučona,
Jak gierwiackaja warona,
Choć by ty była światajа,
Prapadzieš, jak myš rudaja!
Treba wyleźci sa skury,
Pierajści żalezny rury;
Praz ahoń, wadu praleźci,
Kab ūsio tyje pieranieści,
Čaho chočuć ūsie ustawy.
Woś jakija u nas sprawy!
Dyk waźmi sama padstrojsia:
Adzień syna — dy nia bojsia!..."
Stary mnoha čaho bajaū:
Chwaliū dobrych, błahich łajaū...
I tak pozna zabałtaūsia,
Što i nanač tut astaūsia.

VII.

Hanna dzieda abdaryła,
Jak skazaū, tak i zrabiła:
Pierš chłapca pacaławała,
Pośle chustku zawiazała;
Ūskłała doūhuju spadnicu,
Zawiazała pajašnicu;
Kładzie koftu, zašpilaje,
„Cicha, synku!" paciašaje:
„Wot pajedziem ū Arhientynu,
Až da taty, u haščinu.
A jak wyjedziem na mora,
Tady skinieš heta hora."
Ale nowaja „Paūlina"
Wyhladała jak dubina.
I adziety prociū mody—
Byū padobny da kałody.
Staić chłapiec—kisła mina —
Ni to baba, ni dziaūčyna:
Maūčyć, biedny, biezjazyki;
I niazhrabny i wialiki,
Na im babskaja spadnica,
Hruby, doūhi, jak zwanica.
A siastra z jaho śmiajecca.
Matka swarycca, złujecca.
Dyk woś płakać stali dwoje.
A narešcie usie troje
Sierad chaty, jak stajali,
„Lamentacii" piajali...

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ū Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowi